# ЗАДАННІ ГАРАДСКОГА МІЖПРАДМЕТНАГА КОНКУРСУ “ШЛЯХАМІ ТВОРЦАЎ” (2023 г.)

I. Выберыце правільны варыянт адказу (1 бал за кожны правільны адказ)

1. Хто з вядомых мастакоў быў прыгавораны да смерці за ўдзел у паўстанні 1830-1831 гг.?
А) Напалеон Орда;
Б) Казімір Альхімовіч;
В) Юдаль Пэн;
Г) Іван Хруцкі.

2. У якім горадзе пасля закрыцця Віленскага ўніверсітэта знаходзілася адзіная на Беларусі вышэйшая навучальная ўстанова, студэнты якой дапамаглі паўстанцам узяць гэты горад?
А) Свіслач;
Б) Горкі;
В) Мінск;
Г) Горадня.

3. Як у рамане Уладзіміра Караткевіча “Каласы пад сярпом тваім” называлася таемная арганізацыя, што рыхтавала паўстанне?
А) “Змова”;
Б) “Братэрства”;
В) “Агул”;
Г) “Помста”.

4. З якой краінай параўноўваюць Беларусь у наступных словах з рамана “Каласы пад сярпом тваім”:
“…край, накшталт няшчаснай …, жыве сярод балотных тумаоў, харчуецца бульбай і паданнямі і нясе залатыя яйкі тыранам. Мала бульбы і замнога фантазіі... І так ва ўсім. Наш край, мая зямля. Багатая, прыгожая, мяккая душамі людзей…”
А) Украіна;
Б) Чэхія;
В) Ірландыя;
Г) Венгрыя.

5. У аснову новай літаратурнай беларускай мовы ляглі гаворкі:
А) Цэнтральнай Беларусі;
Б) Усходняга Палесся;
В) Панямоння;
Г) Віцебшчыны.

6. Пра якія падзеі аўтар рамана “Каласы пад сярпом тваім” напіша наступныя словы: “выхадка гераічная, але бессэнсоўная і таму трагічная”?
А) Паход на Гарыпяцічы;
Б) Мітынг 1861 года ў Варшаве;
В) Бунт у Півошчах;
Г) Напад на канвой, што суправаджаў асуджаных на катаргу.

7. Найвялікшай групай сялян у сярэдзіне XIX ст. у Беларусі былі:
А) Памешчыцкія сяляне
Б) Дзяржаўныя сяляне;
В) Вольныя сяляне;
Г) Даннікі.

8. Міхал Рукевіч быў кіраўніком гэтага таемнага таварыства:
А) Філаматаў;
Б) "Паўночнага таварыства";
В) Таварыства ваенных сяброў;
Г) "Дэмакратычнага таварыства".

9. Як называецца першы зборнік вершаў Уладзіміра Караткевіча?
А) "Матчын дар";
Б) "Матчына сэрца";
В) "Матчына душа";
Г) "Матчына любоў".

10. На якім/якіх факультэце/факультэтах Пецярбуржскага ўніверсітэта вучыўся Алесь Загорскі ?
А) філасофскі;
Б) філалагічны;
В) гістарычны;
Г) медыцынскі.

II. Расстаўце падзеі ў храналагічнай паслядоўнасці (5 балаў за кожны правільны адказ).

1. А) Нараджэнне Алеся Загорскага
Б) Разгром паўстання дзекабрыстаў на Сенацкай плошчы;
В) Пачатак паўстання, у якім удзельнічала Э. Плятэр;
Г) Адмена дзеяння Статута ВКЛ у Прыдняпроўі.

2. А) Першы падзел Рэчы Паспалітай;
Б) Сустрэча Акіма Загорскага з Кацярынай II у Полацку;
В) Нараджэнне Данілы Загорскага;
Г) Усталяванне надмагільнай пліты з надпісам Vale, principium finis mei!

3. А) Адмена прыгоннага права ў Расійскай імперыі;
Б) Выключэнне Алеся Загорскага з універсітэта;
В) Забойства Юлляна Лапаты і збіццё Стафана Кагута;
Г) Смерць Тодара Таркайлы.

4. А) Алесь Загорскі едзе вызваляць Андрэя Кагута;
Б) Пачатак студзеньскага паўстання ў Польшчы, Літве і Беларусі;
В) Кастусь Каліноўскі атрымлівае надзвычайныя правы як "дыктатар" паўстання;
Г) Прызначэнне Міхаіла Мураўёва віленскім генерал-губернатарам.

5. А) Нараджэнне двайнят Юрыя і Антаніды;
Б) Вяселле Алеся Загорскага і Міхаліны Раўбіч;
В) Двубой Алеся Загорскага і Франца Раўбіча;
Г) Хвароба Алеся Загорскага ("мроя").

III. Дапоўніце сцвярджэнне ці адкажыце на пытанне.
(2 балы за правільны адказ)

1. Пад якой назвай вядома працэдура праверкі дакументаў аб дваранскім паходжанні?

2. Запішыце назву прydняпроўскай мафіі, што спляжыла плантацыі Алеся Загорскага?

3. Паншчына – гэта…

4. Каму Уладзімір Караткевіч прысвяціў раман “Каласы пад сярпом тваім”?

5. Што адлюстравана на малюнку?



6. Які вядомы выраз з “Пісем з-пад шыбеніцы” характарызуе палітычныя погляды К. Каліноўскага?

7. Як сямейная гісторыя Уладзіміра Караткевіча паўплывала на яго зацікаўленасць тэмай паўстання 1863-1864 гг.?

8. Якія былі апошнія словы К. Каліноўскага, якія ён прамовіў перад павешаннем?

9. У якой вайне ўдзельнічаў Ілля Хаданскі – адзін з герояў рамана “Каласы пад сярпом тваім”? Запішыце назву гэтай вайны і гады, калі яна адбывалася.

10. Які ўплыў мела паўстанне 1863-1864 гг. на лёс часоваабавязаных адносін сялян у Беларусі і Літве?

11. Як называлася вайсковая павіннасць у Расійскай Імперыі?

12. Якому знакамітаму паэту Алесь Загорскі чытае свой верш?
Запішыце імя і прозвішча паэта. Пра што быў той верш?

13. Што сімвалізавала вызваленне і справядлівасць у песні дзеда Данілы Кагута?

14. Якая падзея адлюстравана на малюнку?



15. У якім горадзе праходзіў царкоўны сабор, які знішчыў уніяцкую царкву?

16. Якая групоўка паўстанцаў мела найбольшы ўплыў у Літоўскім правінцыйным камітэце на момант яго стварэння?

17. Якія дзве мэты ставілі перад сабой Алесь, Мсціслаў і Кандрат, калі ехалі ў Маскву?

18. Як называлася групоўка паўстанцаў, якая імкнулася не дапусціць перарастання паўстання ў сялянскую рэвалюцыю?

19. Якую назву мела рэвалюцыйная газета, якую выдавалі Фелікс Ражанскі і Валер Урублеўскі і большасць матэрыялаў якой напісаў Кастусь Каліноўскі?

20. Растлумачце сэнс традыцыі дзядзькавання.

IV. Ніжэй пададзены характарыстыкі персанажаў з твораў Уладзіміра Караткевіча.
Вам трэба запісаць імёны і прозвішчы герояў.
(2 балы за правільны адказ)

**Частка А**

| **Характарыстыка** | **Імя персанажа** |
|---|---|
| 1. “Попельныя, з няўлоўным залацістым адценнем валасы. Пад матавай скурай на шчоках глыбінны празрысты румянец. Добры рот і вочы…”<br>“Агеньчыкі свечак адбіваюцца ў шырокіх і сініх, як марская вада, вачах…” | |
| 2. “…бялявы мужык у расхрыстаным кажуху. Рукаў кажуха быў адарваны: з вялікай дзіркі, як махры эпалета, падалі на плячо касмыкі аўчыны. Звычайны мужык год пад трыццаць, засівералы, дужы. Незвычайныя былі толькі вочы. Чорныя, дрымучыя, яны з непрыхаванай нянавісцю глядзелі…” | |
| 3. “Шырокі і загарэлы ледзь не да гарчычнага адцення, ён увесь быў папаласаваны і зрэзаны страшнымі шнарамі, якія толькі нейкім дзівам не закранулі носа і вачэй. Тоўстага гарбатага носа і бязлітасных блакітных вачэй пад чорнымі брывамі. Вусы былі таксама чорныя і доўгія, але нават яны не маглі схаваць ганарыстых, напышліва падціснутых вуснаў. А вось чорныя кудлы на галаве нехта густа перавіў сівым павуціннем…” | |
| 4. “У яе было бледнае аблічча з вялізнымі вачыма. Яны былі большыя, чым ва ўсіх людзей на зямлі...” | |
| 5. “…сядзеў неяк больш вольна і лёгка. Каштанавыя, вельмі іскрыстыя пад сонцам валасы гэтага хлопца ляжалі буйнымі хвалямі. Цёмна-шэрыя шырокія вочы спакойна глядзелі…”<br>”Манеры ледзь не версальскія, мова мужыцкая, вопратка разбойніцкая, думкі — якабінскія... | |
| 6. “… вузкія, зеленаватыя, як у рысі, вочы пад пясочнымі брывамі, храшчаваты нос і маладыя, але ўжо шчэцістыя вусы і бакенбарды. Твар быў бы амаль грубы, хаця і прыгожы, каб не вішнёвыя вусны і зусім юны, празрыста-ружовы румянец тугіх шчок.<br>Гэты чалавек кепска загараў… Але цікавей за ўсё былі рукі: учэпістыя, вельмі характэрныя і прыхавана-нервовыя, са сплюшчанымі на канцах, як долата, пальцамі.” | |
| 7. “…стаяў белы стары, белы ад галавы да нагавіц. Стаяў, абапіраючыся на кантовы чорны кій з вострым канцом.” | |
| 8. “…у свае сорак пяць год хадзіў усё яшчэ «ў дзяўкох», а такія звычайна выдаткуюць меней. Але ж вядома, нежанаты пан часам большая бяда, чым той, | |

| | |
|---|---|
| у каго пяцёра дзяцей. А ў ... быў яшчэ і няшчасны для мужыкоў разгульны характар. Жаніцца ён наогул не хацеў і яшчэ больш не хацеў пасля смерці павялічваць багацце Загорскіх.” | |
| 9. “Чорныя як смоль і сівыя на скронях валасы стваралі на патыліцы магутную грыву, а спераду падалі на лоб касой скобкай… Але самыя дзіўныя былі вочы: халодныя, карыя, з такімі пашыранымі зрэнкамі, што райка, здаецца, зусім не было. Гэтаму ўражанню дапамагала яшчэ і тое, што вейкі былі доўгія і густыя, зусім не мужчынскія, а на павеках, займаючы ўсе вачніцы, ляжаў асмужаны цёмны цень”. | |
| 10. “Гэта быў адначасова чалавек вельмі харошы і вельмі дрэнны. Яго добрыя якасці былі прыродныя. Яго недахопы — недахопамі стагоддзя. І ўсё, што ён ні рабіў, сведчыла аб гэтым.” “Яму было пяцьдзесят чатыры, калі ён канчаткова страціў веру ў сумленне і гонар улад, у карыснасць дзяржаў, у тое, што свет ідзе да лепшага.” | |

**Частка Б**

| Характарыстыка | Імя персанажа |
|---|---|
| 1. “…страляў у людзей з гармат…” “…чалавек з грэнадзёрскім ростам і розумам абозніка.” | |
| 2. “Вусы варухнуліся, але нават калі б гэтага не было, аб усмешцы можна было б здагадацца па вачах. Вось што маладзіла чалавека: вочы! Залаціста-карыя і, дальбог, пякуча-сінія, як паўдзённае неба. У вачах нейкая пакутлівая вечная думка, якая катавала і нават у хвіліну весялосці не давала палёгкі. Цяжкі, знясілены нейкай неадчэпнай думай, змардаваны і грозны твар… Дзве рукі сціснулі Алесевы плечы. Ён адчуў, як лёг на ягоны лоб, над левым вокам, пацалунак, што пахнуў цыгарай, здаецца, нейкімі сухімі травамі і трохі віном.” | |
| 3. “У кутку, асобна ад усіх, сядзеў худы высакалобы чалавек у бутэлечнага колеру сурдуце і шырокім белым гальштуку. Рукі з доўгімі пальцамі нервова гулялі брэлокамі гадзінніка, перабіралі іх, як ружанец. Калі спрэчка выбухала раптам пагрубелымі ад запалу галасамі — чалавек моршчыўся, як моршчыцца меламан з абсалютным слыхам, пачуўшы скрогат цагліны аб цагліну. Мяккае, вельмі беларускае аблічча чалавека было тонкае і жоўчнае. Доўгія, трохі блізка адно да аднаго пасаджаныя вочы глядзелі сумна і засяроджана. І буйнымі добрымі хвалямі падалі на плечы русыя валасы”. | |
| 4. “Бачыў, між іншым, нашага «Лабыра». Ехаў па Неўскім. У абліччы самае цікавае — прычоска, а падбароддзя зусім няма…” “…патрэбна было рэнамэ свабодалюбца і дэмакрата…” | |
| 5. “Было шкада, што ён піша па-польску, устаўляючы ў кнігу беларускія дыялогі. У сваёй мове ён мог бы стаць вялікім. У чужой — толькі вышэй за сярэдняга. …здольны і добры чалавек, шмат у чым блізкі да Гогаля, назваў сябе беларусам, а радзіму — Беларуссю, магчыма, нават занадта настойліва. Ён пяшчотна любіў край, яго паданні, яго людзей.” | |
| 6. “…маленькі капрал, спрытнюга, маленькі абабівач грушак чужымі рукамі… ты вялікі палкаводзец, але не вялікі чалавек…Проста ты лялечнік, што тузае ніткі марыянетак, як кожны тыран, у якім заўсёды ёсць і будзе нешта ад халуя. | |
| 7. “Занадта інтэлігенцкі шыракаваты твар з добрымі, відаць, блізарукімі, вачыма. Такому б сядзець у хаце, такому б замест сурдута, нават тут, больш пасаваў бы шлафрок…працуе арганістам у Святаянскім касцёле…” | |
| 8. “Старшыня Дзяржаўнага савета і камітэта міністраў… Ад мінулага ў яго асталіся пэўныя схільнасці. У сучасным было поўнае фізічнае і маральнае падзенне, аж да таго, што ён маўчаў, поўзаў па падлозе і еў з пастаўленай на ёй місы, як сабака. Невядома, што магло апраўдаць | |

| | |
|---|---|
| знаходжанне такога чалавека на высокай дзяржаўнай пасадзе. Тут не магло быць нават пытання аб дэкоруме, але гэта факт. Поўны вар'ят, жывёла з замашкамі жандара, больш за год займаў гэты пост. | |
| 9. "Трохі смешны, лабасты, але худы ў шчоках і востры ў падбароддзі, гэты хлопец наіўна цікаваў на свет вузкімі, як шчылінкі, глядзелкамі, якія нібыта толькі што прарэзаліся. Смешнае, сімпатычнае барсучаня… Хлапец глядзеў сваімі вузкімі вочкамі, і былі ў гэтым позірку цяжкаватая дапытлівасць, розум і адвечная — амаль не ад чалавека — прага праўды.<br>Падрастала другая змена паўстання..." | |
| 10. "…твар паважнага бюракрата. Трывожылі толькі вочы. Іронія, сум, стома, розум, чэрствасць і няўлоўная весялосць арганічна спалучаліся ў іх. Гэта маглі быць вочы іроніка, стомленага бюракрата, дзяржаўнага мужа. Гэта былі адначасова вочы вернападданага і вочы знаўцы свету — пісьменніка…<br>без двух месяцаў упраўляючы міністэрствам унутраных спраў, без дзевяці месяцаў — міністр і роўна без дзевятнаццаці год — граф. Былы нястойкі ліберал, былы ўлюбёнец Мікалая Першага, а цяперашні «асвечаны кансерватар» і дырэктар двух (а ўсяго было чатыры) дэпартаментаў міністэрства дзяржаўных маёмасцяў, правая рука міністра Мураўёва." | |

V. Прачытайце звесткі аб гістарычных асобах. Выпраўце факталагічныя памылкі (2 балы, калі знайшлі памылку і 2, калі змаглі выправіць.)

| № | Аўтар | Адказы |
|---|---|---|
| 1 |  **Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч** па праву лічыцца першым класікам новай беларускай літаратуры. З 1827 года юнак распачынае чыноўніцкую кар'еру. У 1840 набыў невялікі маёнтак Вязынка. Падчас паўстання 1863—1864 гадоў абвінавачваўся ў распаўсюджванні «шкодных для ўрада» ідэй. Быў арыштаваны. Да самай смерці ён заставаўся пад наглядам паліцыі. Сын Каміл за сувязь з паўстанцамі быў выслана ў Сібір. У 1846 годзе ў Вільні надрукаваны яго драматычны твор «Сялянка» («Ідылія»), у якім сяляне гаворыць па-беларуску. У 1860-я — 1870-я гады напісаў камедыю «Мінская шляхта» (аўтарскае вызначэнне: фарс-вадэвіль), дзе аўтар выкрывае паразітычную сутнасць царскага чыноўніцтва. | |
| 2 |  **Вінцэ́нт-Канстанцін Каліноўскі** У 1856 годзе паступіў на медыцынскі факультэт Пецярбургскага ўніверсітэта. Вярнуўся на Радзіму і распачаў стварэнне на Гародзеншчыне рэвалюцыйнай арганізацыі. Кастусь агітаваў сялян да паўстання, распачаў выпуск «Мужыцкай праўды» — першай у гісторыі газеты на беларускай мове. Кожны нумар газеты быў падпісаны псеўданімам Каліноўскага «Сымон Рэўка з-пад Барысава». У 1862 г. Каліноўскі ўжо ўваходзіў у склад Беларускага правінцыяльнага камітэта — цэнтральнага органа падрыхтоўкі паўстання на тэрыторыі Паўночна-Заходняга края. | |

| | | |
|---|---|---|
| **3** |  **Караткевіч Уладзімір Сямёнавіч**<br>нарадзіўся 26 лістапада 1930 года ў Мінску ў сям'і інтэлігентаў. У 1949—1954 гадах У. Караткевіч вучыўся на філалагічным факультэце Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Т. Р. Шаўчэнкі. Пасля ад'езду з Кіева У. Караткевіч настаўнічаў у вёсцы Лесавічы на Кіеўшчыне. У 1955 годзе ў часопісе «Полымя» упершыню быў надрукаваны верш У. Караткевіча «Машэка».<br>У.Караткевіч пступае на вышэйшыя літаратурныя курсы ў Маскве. Раман «Каласы пад сярпом тваім» асобным выданнем выйшаў у 1975 годзе. Пазнаёміўся з жонкай на чытацкай канферэнцыі па сваім рамане «Каласы пад сярпом тваім» | |
| **4** |  **Кацярына I**<br>Расійская імператрыца. Перыяд яе праўлення часта лічаць «залатым векам» Расійскай імперыі. У яе праўленне былі ажыццёўлены падзелы Рэчы Паспалітай, у выніку якіх да Расіі адыйшлі Беларусь, часткі ўкраінскіх земляў і Латвія. У 1791 г. устанавіла "мяжу аселасці", якая абмяжоўвала права яўрэяў пражываць у цэнтральных губерніях Расіі. | |
| **5** |  **Валуеў Міхаіл Мікалаевіч**<br>Вайсковы і дзяржаўны дзяяч Расійскай імперыі. Генерал-губернатар Паўночна-Заходняга краю ў час здушэння нацыянальна-вызвольнага паўстання. Ухвальна паставіўся да сялянскай рэформы 1861 году. За сваю жорсткасць Мураўёў увайшоў у гісторыю пад мянушкай *палач*. Акрамя гэтага, шырока вядомы яго дэвіз у дачыненні да русіфікацыі Беларусі — «Што не дарабіў расійскі штых — даробіць расійская школа». | |